# «Беларускамоўныя складанасці»: дыктоўка-пераклад

Кожны з нас павінен ганарыцца сваёй краінай і клапатліва ахоўваць скарб, атрыманы ў спадчыну, — нацыянальную мову. Аднак часам узнікае неабходнасць надаць ёй крыху больш увагі, чым звычайна. Вось таму ў рамках Тыдня беларускай мовы, які праходзіў у БДЭУ, кожнаму прадставілася магчымасць праявіць свой талент і выразіць шчырую любоў і ўдзячнасць роднай мове. Гэтай жа магчымасцю скарысталіся і студэнты ФЭМ, прымая ўдзел у розных мерапрыемствах. Не засталіся ўбаку і студэнты 5 курса завочнай формы навучання, якія па прапанове дэкана на арганізацыйнай сустрэчы з ёй размаўлялі толькі па-беларуску.

А вось апошнюю кропку на Тыдні беларускай мовы 24 верасня паставілі студэнты факультэта, якія па ініцыятыве ПА ГА БРСМ ФЭМ напісалі дыктоўку на эканамічную тэматыку. І трэба заўважыць, што нялёгка было справіцца з тым тэкстам, які быў падрыхтаваны нашай ініцыятыўнай групай. Але галоўная задача была вырашана! Сумеснымі намаганнямі вынік атрымаў кожны!

І ў завяршэнні хацелася б сказаць: наша мова вылучае нас у сусветнай супольнасці і з’яўляецца нябачным, але магутным падмуркам, які захоўвае нас як адзіную нацыю, таму давайце разам берагчы і захоўваць родную мову не ў асобыя тыдні, а кожны дзень!